нання. Існуе два спосабы. Першы. У мэтах захавання рытму неабходна памятаць аб тым, што даўжэйшая доля выконваецца не за кошт павольнасці тэмпу, а за кошт павелічэння амплітуды.

Другі. Даўжэйшая па часу доля выконваецца не за кошт павелічэння амплітуды, а за кошт прыпынку рукі. Ен робіцца ў ніжнім пункце большай долі. Калі-нікалі прыпынак замяняецца дадатковым рухам рукі ў бок ў выглядзе пятлі ці зігзагу і тым самым робіць долю даўжэйшай па часе.

Пры авалоданні навыкамі дырыжыравання несіметрычных долей карысна вымаўляць словы: раз, два-тры , чатыры , пяць або розныя словазлучэнні, напрыклад: дум-ба/ дум-ба-ра. Гэтыя практыкаванні выконваць у розных варыянтах і схемах, спачатку ў павольным, а потым у хуткім тэмпе.

XX стагоддзе — час вялікіх змен у музыцы. У творчасці сучасных кампазітараў рысы новага перапляліся з народнай творчасцю, лепшымі традыцыямі кампазітараў-класікаў. У галіне харавога жанру напісана многа твораў, у якіх сустракаюцца несіметрычныя памеры. Яны могуць быць цікавымі і карыснымі для студэнтаў дырыжорска-харавой спецыялізацыі. Напрыклад: Ленскі А. Опера «Якаў Шыбалок», хор станічнікаў; Шастаковіч Д. «Пакаранне смерцю Сцяпана Разіна»; Бойка Р. «Валагодскія карункі»; Тамбер Э. «Родная зямля».

Цікавыя і апрацоўкі народных песень, якія зроблены рускімі і беларускімі кампазітарамі:

Салманаў Ул. «Бела-румяна»; Калоўскі А. «На гарушцы, на гары»; Турышаў А. «Румяна поле» і інш.

Творы, у якіх сустракаюцца несіметрычныя памеры, трэба ўключаць у індывідуальныя планы студэнтаў. Глыбокае іх вывучэнне будзе садзейнічаць не толькі ўдасканаленню дырыжорскай тэхнікі, але мастацкаму выхаванню будучага дырыжора.

**Грабеннікаў Р.В.,**
*прафесар*

## РОЛЯ САЦЫЯЛАГІЧНЫХ ВЕДАЎ У ПРАЦЭСЕ РАЗВІЦЦЯ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ

Праблема здольнасцей чалавека пры вялікім дынамізме развіцця грамадства і адпаведна павышэнні патрабаванняў да асобы становіцца вельмі актуальнай. Гэта тлумачыцца тым, што ўкараненне ў матэрыяльную і духоўную вытворчасць дасягненняў сацыяльнага і навуковага прагрэсу дыктуе неабходнасць адпаведнага ўліку здольнасцей чалавека да таго альбо іншага віду дзейнасці ў складанай сістэме грамадскай вытворчасці.

Для работнікаў культуры праца па ўліку здольнасцей мае асабліваe значэнне, бо без іх нельга творча працаваць як у клубе, так і ў бібліятэцы, і тым больш кіраваць хорам або фальклорным калектывам. У паспяховым рашэнні гэтай творчай і вельмі складанай праблемы вялікую ролю маюць заняткі па сацыялогіі, якія выяўляюць, з аднаго боку, агульныя і прафесійныя здольнасці студэнтаў, а з другога — паглыбляюць іх развіццё. Аднак паспяховае рашэнне такой задачы звязана з выкананнем жорсткіх патрабаванняў: выкарыстанне ведаў па сацыялогіі нельга праводзіць фармальна, яно павінна быць творчым, г.зн. з абавязковым улікам асаблівасцей прафесійнай спецыялізацыі студэнтаў і іх агульнага развіцця. Такі падыход дыктуецца тым, што студэнту трэба творча ўспрымаць сацыялагічныя паняцці, як і паняцці іншых вучэбных дысцыплін. Важна, каб студэнты, тыя веды, што яны атрымоўваюць на занятках, самі перапрацоўвалі і прапускалі праз прызму сваіх прафесійных здольнасцей, развіваючы і ўзбагачаючы іх. Адсюль у кожнага вучня засваенне тэарэтычных ведаў (у першую чаргу катэгорый і законаў) павінна ісці не абстрактна, а праз яго асобыя здольнасці (агульныя і прафесійныя). Дзякуючы гэтаму дасягаецца двайны эфект: здольнасці студэнта атрымліваюць сацыялагічны імпульс свайму развіццю, а сацыялагічны вучэбны матэры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ял (тэарэтычны і практычны) больш лёгка і трывала засвойваецца навучэнцамі. Такая асаблівая ўвага да сацыялагічных ведаў тлумачыцца і тым, што курс сацыялогіі чытаецца ў нашых ВНУ ў параўнанні з заходнееўрапейскімі універсітэтамі са спазненнем на сто гадоў.

У ВНУ лекцыйны курс, семінарскія і практычныя заняткі дазваляюць (праз выбар і абмеркаванне актуальных тэм канкрэтных сацыялагічных даследаванняў, абгрунтаванне метадаў збору інфармацыі і асобна распрацоўкі гіпотэз развіцця культуры ў сучасных рынкавых умовах) фарміраваць і развіваць як агульныя, так і прафесійныя здольнасці студэнтаў. Такім чынам, праз сацыялагічныя веды і метады ідзе самасцвярджэнне навучэнцаў з улікам іх здольнасцей, што вельмі эфектыўна садзейнічае павышэнню творчай актыўнасці студэнтаў у навучанні і выхаванні.

Трэба падкрэсліць, што здольнасці студэнтаў раскрываюцца і развіваюцца толькі ў практычнай дзейнасці. Як нельга навучыць плаваць без вады, так нельга выявіць і развіць здольнасці студэнтаў, пакуль яны не пачнуць сваю прафесійную і грамадскую дзейнасць у матэрыяльнай, духоўнай ці сацыяльнай сферы. Здольнасці не бываюць абстрактнымі, яны заўсёды канкрэтныя ў якой-небудзь дзейнасці. І не статычныя, бо развіваюцца і змяняюцца ўслед за дынамічным развіццём рэчаіснасці. Таму адначасова з паглыбленнем, пашырэннем і ўскладненнем прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў неабходна ўзбагачаць іх здольнасці. Калі такога ўзбагачэння не адбываецца, то авалоданне прафесійнымі ведамі ў навучэнцаў ідзе ўжо не творча і без апоры на іх здольнасці.

Неабходнасць пашыранага выкарыстання сацыялагічных ведаў для развіцця здольнасцей студэнтаў вельмі актуальна ў навучальных установах культуры і мастацтва. Гэта дыктуецца тым, што студэнты ў даных установах вывучаюць (у параўнанні з другімі ВНУ) больш глыбокія па гуманістычнаму зместу вучэбныя дысцыпліны, а для гэтага патрэбны асаблівыя здольнасці, каб зразумець усю складанасць культурных (а не толькі вытворчых) узаемасувязей людзей.

Характар ці напрамак даных узаемасувязей нельга дакладна па стандарту ацэньваць, замяраць. У сферы культуры няма жорсткіх практычна-выніковых сувязей і адпаведных ім законаў. Так, адукацыя ў культурнай дзейнасці павышае прадукцыйнасць працы — гэта як закон. Аднак яна (адукацыя) можа даць для работніка культуры зусім розныя вынікі: у таго, хто мае здольнасці да яе, будуць высокія поспехі, а хто іх не мае, вынік можа быць прама процілеглы. Адсюль рэзультатыўнасць працы ВНУ культуры прама залежыць ад таго, наколькі дакладна ўлічаны (пры паступленні ў абітурыентаў, а пасля ў студэнтаў) прафесійныя і агульныя здольнасці, як далей яны поўна выкарыстоўваюцца ва ўсім навучальным і выхаваўчым працэсах.

Падкрэслім, што ўзровень прафесійных здольнасцей студэнтаў (як цэласнае адзінства генетычнага і сацыяльнага) у многім абумоўліваюць не толькі іх паспяховасць, але і галоўнае — ступень творчага авалодання будучай спецыяльнасцю. Таму павінна весціся асобная праца як з адоранымі, так і таленавітымі студэнтамі. Адсутнасць прафесійных здольнасцей у студэнтаў можа стаць прычынай іх непаспяховасці і ў цэлым няздольнасці закончыць ВНУ, стаць творчымі работнікамі культуры. Такім чынам, нельга ўспрымаць як незвычайную з'яву і непапраўную трагедыю, калі некаторыя студэнты з-за прафесійнай непрыдатнасці будуць адлічаны з ВНУ. Напрыклад, у сусветна вядомай карпарацыі IBC ад 100 прэтэндэнтаў на пастаянную працу залічваюць толькі аднаго, г.зн. вышэйшая па ўзроўню складанасці і творчасці праца дыктуе адпаведна надзвычай высокія патрабаванні да прафесійнай падрыхтоўкі і здольнасцей працоўных кадраў.

Адсутнасць у студэнтаў здольнасцей да мастацкіх спецыяльнасцей нельга замяніць завучанымі прафесійнымі ведамі і механічна адрэпетыраванымі навыкамі і ўменнямі.

Такім чынам, праблема здольнасцей студэнтаў выступае важнейшай і актуальнай праблемай сучаснасці, бо кожная асоба толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з моманту рэалізацыі сваіх здольнасцей робіць першы крок да дасягнення галоўнай жыццёвай мэты — самасцвярджэння свайго «Я» праз ажыццяўленне асобых задаткаў і здольнасцей.

**Грынкевіч Н.П.,**
*дацэнт*

## СТЫМУЛЯВАННЕ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ЗАНЯТКАХ ПА ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ

Неабходнай умовай павышэння ўзроўню эфектыўнасці працэсу навучання ў вышэйшай школе з'яўляецца стымуляванне пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Для гэтага неабходны ўдасканаленне метадаў і арганізацыйных формаў вучэбнай працы.

Па праблеме стымулявання пазнавальнай дзейнасці ў навучальным працэсе праведзена нямала даследаванняў, у якіх разгледжаны асобныя аспекты гэтай праблемы. Даследаванні сведчаць аб яе складанасці і шматграннасці. Стымуляванне пазнавальнай дзейнасці накіравана на развіццё пошукавых і творчых здольнасцей.

Даследчыкі праблемы педагагічнага стымулявання (Л.Ю.Гордзін, З.І.Раўкін, В.П.Шуман, Г.І.Шчукіна і інш.) разглядаюць стымулы як сродкі, якія вымушаюць людзей да больш эфектыўнай дзейнасці і аказваюць безумоўнае ўздзеянне на сістэму матываў, выконваюць ролю паскаральнікаў дынамікі патрабаванняў чалавека. Адсюль вынікае, што галоўная задача педагагічных стымулаў, што выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе,— выклікаць і развіць матывы, якія адпавядаюць мэтам і сутнасці пазнавальнай дзейнасці студэнтаў.

Педагагічныя стымулы бываюць знешнія (непасрэдныя) і ўнутраныя (апасродкаваныя). Знешнія стымулы ў педагагічным працэсе дзейнічаюць праз унутраныя. Знешнія стымулы пазнавальнай дзейнасці студэнтаў можна назваць арганізацыйна-педагагічнымі. Гэта пэўныя сродкі і спосабы педагагічнага ўздзеяння, якія выкарыстоўваюцца выкладчыкам у навучальным працэсе з мэтай уплыву на псіхічнае развіццё студэнта. Да ўнутраных стымулаў адносяцца такія, якія мабілізуюць разумовыя і валявыя працэсы, напрыклад цікавасць да ведаў, імкненне да пашырэння і паглыблення ведаў, патрэбнасць у вывучэнні прадмета ці з'явы і інш. Калі ўнутраныя стымулы пераважаюць над знешнімі, то гэта дазваляе актывізаваць пазнавальную дзейнасць студэнтаў, больш эфектыўна ўплываць на развіццё іх творчых здольнасцей.

На стымуляванне пазнавальнай дзейнасці студэнтаў могуць уздзейнічаць розныя фактары: змест вучэбнага матэрыялу, метады навучання, арганізацыйныя формы, асоба выкладчыка і інш. Таму асабліва важным мы лічым выяўленне найбольш перспектыўных накірункаў у вырашэнні гэтай праблемы. Вядучым сродкам стымулявання пазнавальнай дзейнасці студэнтаў з'яўляецца праблемнае навучанне. Асноўнай катэгорыяй такога навучання мы лічым праблемную сітуацыю. Яна фарміруецца з дапамогай задання, якое патрабуе адкрыць, засвоіць раней невядомыя веды, выкарыстаць на практыцы. Для ажыццяўлення гэтага неабходны вялікая інтэлектуальная актыўнасць навучэнцаў, іх творчая разумовая дзейнасць.

Вопыт выкладання замежнай мовы пераконвае, што праблемны падыход можа ажыццяўляцца на любым этапе навучання. Праблемныя заданні выкарыстоўваюцца намі пры навучанні дыялагічнай і маналагічнай мове. Мы выкарыстоўваем так званую «практычную творчасць», гэта значыць «пошук спосабу прымянення вядомых ведаў у новай сітуацыі». У аснове гэтага віду праблемнага навучання ляжаць пастаноўка і вырашэнне практычных вучэбных праблем. Пад творчымі заданнямі мы разумеем заданні, якія накіраваны на развіццё творчых здольнасцей студэнтаў (творчага стылю мыслення, уменняў актуалізаваць ранейшыя веды, абагульняць і сістэматызаваць іх, творча выкарыстоўваць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ